рэчы, як гэта даўно ўжо заўважылі даўнейшыя людзі. І калі гэта я пішу, дык мяне таксама хвалюе думка пра тое, што даўно ўжо я дакляраваў напісаць ліст і што адрасат яго пэўна–ж чакае, а я дасюль усё яшчэ ня справіўся з гэтым лістом, не перамог яго і не адаслаў. Дык ат–жа і хай ідуць гэтыя думкі лістом замест апраўданьня. Уцехай для іх будзе зайсьці да цябе і сказаць табе, што іх гаспадар і жыў і здароў, і яны прыйшлі замест яго самога, каб на гэтым уздальлі прывітаць цябе з пачаткам новага (ва ўсіх дачын[еньнях]) уздальнага жыцьця.

## № 70. Язэпу Пушчу

*27/V–1933 г.*

Дарагі Язэп!

То ж учора была гадавіна ўзвышэньня, дык памянем яе добрым словам. Думаю, што быўшы й на выгнаньні думкамі і пачуцьцямі, мы будзем і далей узвышацца на славу нашай радзімы і на ўрэд усім нашым непрыяцелям. Спадзяюся і ад цябе пачуць добрае слова, што не закінуў ты свае творчасьці і працуеш далей. Пэўна, закончыў ужо свой распачаты яшчэ дома вялікі твор. Прарві сваё маўчаньне хоць слоўцам выгнаньніцкага прывету! То ж дачуўся я аколіцай, што ўсе мае лісты і лістоўкі дайшлі да цябе ў добрым здароўі, а ты ні на водную нават пары слоў не напісаў. Як жывеш? Як гадуюцца дзеці? Дзе працуеш? Уладзя надоечы пісаў, што Жылка памёр у сакавіку м[еся]цы гэтага году. Не давялося выкарыстаць, на жаль, права пражываньня па ўсім СССР, якое далі яму з 1 студзеня г[этага] г[оду]. Як хацелася яму даехаць бліжэй да роднага краю, меўся ж пераехаць у Смаленск. Ажно знайшоў спакой (калі гэта спакой!) на далёкай старане. Мы ўсе здаровы. Дзеці ўжо вялікія, вельмі часта ўспамінаюць Галю і Лялю, зьбіраюцца ім напісаць (то ж абедзьве яны ўжо ліквідавалі сваю непісьменнасьць за гэтыя гады). Пішы.

*Адам.*

## № 71. Язэпу Пушчу

*27/VI–1933*

Дзень добры, дарагі браце Язэп!

Якая слаўная твая лістоўка! Чытаючы, здавалася, ня звычайная лістоўка ў руках, а сама паэзія іскрыцца з простых а цёплых слоў дарагога сябра. Якая радасьць, Язэп, чытаць тут, у краіне голаду і холаду для духа, ліст, што падобен цёпламу праменю вясны ў цьме маўклівага выгнаньня. Твая лістоўка для мяне — гэта знак на тое, што сасьпелі ў душы тваёй „зёрна новых слоў“, што прабіваюцца яны на сьвет, каб паўстаць у ім творамі вытанчанай паэзіі. Каб ведаў ты, як згаладаліся мы па роднай нашай узвышанскай паэзіі! Да таго дайшло, піша мне Антон, што з гэткага голаду пачаў ён сам пісаць вершы, каб хоць чым спатоліць сваю смагу па прыгожаму слову. Язэп, я думаю, што прарыў твайго маўчаньня будзе прарывам маўчаньня і ў тваёй творчасьці. (Гэта ж я чуў, што ты за гэты час анічога не пісаў, ці праўда гэта?) Ад радасьці твае лістоўкі хочацца моцна абняць і пацалаваць цябе. Зьбіраюся лістом напісаць пра сваё жыцьцё тут і свае думкі. Цяпер вельмі ж аклапочаны агародам, збольшага ўжо закончылі пасадку, увосень, спадзяёмся, будзе падмога. Пра